Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Свіслачы аштрафавалі чарговага актывіста

03.12.2018 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Мітынг у Свіслачы 27 кастрычніка. Фота: "Гарадзенская Вясна".

Картка працэсу:

Суд: суд Свіслацкага раёна Гродненскай вобласці

Суддзя: Жана Салагубік

Асоба, у дачыненні да якой вядзецца працэс: Уладзімір Хільмановіч

Артыкул: 23.34 КаАП (удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве)

Рашэнне: штраф 15 (367,5 бел. руб.)

У панядзелак, 3 снежня, Свіслацкі раённы суд аштрафаваў гарадзенскага грамадскага актывіста Уладзіміра Хільмановіча на 15 базавых велічыняў за ўдзел у традыцыйным Дні памяці паўстанцаў 1863 года.

Уладзімір Хільмановіч не меў магчымасці паехаць на разгляд гэтай адміністрацыйнай справы. Ён перакананы, што яна мае выразна палітычны і заранёў вызначаны характар. У Свіслач ездзіў праваабаронца **Віктар Сазонаў,** які перадаў у канцылярыю суда адпаведныя хадайніцтвы Хільмановіча. Праваабаронцы маюць намер аспрэчваць пастанову ў абласным судзе і, чакаючы пастановы разам з матывіровачнай часткай, будуць рыхтаваць касацыйную скаргу.

Такім чынам Уладзімір Хільмановіч ужо шосты беспадстаўна засуджаны за Дзень памяці герояў, які традыцыйна праходзіць у канцы кастрычніка ў Свіслачы і Якушоўцы. Не разгледжаны яшчэ 2 аналагічныя адміністрацыныя справы - **Сяргея Верамеенкі** і **Мікалая Саляніка**.

Нагадаем, што раней старшыня Свіслацкага раённага суда Аляксандр Шылін ўжо аштрафаваў на вялізныя сумы 5-х грамадскіх актывістаў: свіслацкіх **Юры Глебіка** (25 базавых велічынь) і **Віктара Пяцельчыца** (10 базавых), гарадзенцаў **Віктара Сазонава** (15 базавых), **Ігара Банцара** (15 базавых) і **Ежы Грыгенчу** (20 базавых).

Твитнуть




Вясна. Правы чалавека ў …
9 958 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул
"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)
Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)
Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА
У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17

ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітвязняў знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі





АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

"Бяляцкі, прасі літасці!" У Швецыі прадставяць спектакль-чытку паводле твораў Бяляцкага і Знака

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАДЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

